ЛіМ **ЧАСАПІС**

Дакументальнае фота

Новы сезон мінская галерэя "Nova" распачала з сур'ёзнага міжнароднага фатаграфічнага праекта "Відушчае вока", у якім дзякуючы намаганням каардынатара праекта Уладзіміра Парфянка прынялі ўдзел фатографы Біл Крандал (ЗША) і Карэл Цудлін (Чэхія). Прычым атрыманы грант дазволіў запрасіць на адкрыццё выставы і саміх фотамастакоў. Сустрэча гэта, можна спадзявацца, была карысная не толькі мінскім гледачам, прафесійным фатографам і аматарам, але і самім удзельнікам акцыі, якія ўсур'ёз цікавяцца жыццём на постсавецкай прасторы. У галерэі "Nova" прайшлі таксама слайд-лекцыя аб сучаснай дакументальнай фатаграфіі ў ЗША і Чэхіі, "круглы стол" па пытаннях дакументальнага фота, адбылася сустрэча замежных гасцей з вучнямі фотастудыі мінскага Палаца моладзі, сябрамі народнага фотаклуба "Мінск", студэнтамі аддзялення дызайна, выставак і рэкламы БелАМа.

Біл Крандал апошнім часам многа падарожнічае па гарадах Еўропы. Акрамя Мінска, дзе ён ужо другі раз, Біл наведваў Вільнюс, Прагу, Бялград. Ён стала супрацоўнічае з "Washington Post", друкуецца ў шматлікіх газетах і часопісах, мае ўзнагароды Асацыяцыі фатографаў нацыянальнай прэсы. Выстава ў Мінску для яго першая персанальная. Цікавая для беларусаў творчасць і Карэла Цудліна, які з'яўляецца адным з персанальных фатографаў Вацлава Гавела, прэзідэнта Чэшскай Рэспублікі. Ён вядомы на радзіме серыямі дакументальных фатаграфій, прысвечаных вываду савецкіх войскаў з Чэхаславакіі, жыццю яўрэйскіх мястэчак на Украіне, культуры Чэхіі ў посткамуністычныя часы.

Праект "Відушчае вока" задумваўся не проста традыцыйнай азнаямляльнай выставаю. Хаця ў любым выпадку было цікава пазнаёміцца з "поглядам збоку", напрыклад, Біла Крандала на нас саміх. Ягоны Мінск зусім не ўспрымаецца рэпартажнай фіксацыяй. Тут няма новабудоўляў, адзнак еўрапейскасці, але няма і ўяўных знакаў галечы ці бруду. Прыцягвае шчырасць адносінаў мастака да свайго аб'екта. Нездарма ж Біл прыехаў год таму здымаць Мінск проста так, па сваім жаданні і за свае грошы, аднойчы пачуўшы ў палітычных навінах пра існаванне такой дзяржавы, як Беларусь. Ён успрыняў яе не з боку палітычных амбіцый, а проста чалавечых пачуццяў. "Людзі былі галоўнай мэтай маёй паездкі. Хацелася паказаць людзям, якія нічога не ведалі пра Беларусь, рэальную сутнасць гэтай краіны", — засведчыў Біл Крандал.

Карэл прапанаваў гледачам — як асноўны — цыкл здымкаў Украіны, якую ён, дарэчы, пазнаваў таксама самастойна і па ўласным жаданні. Цяпер ён мае там сяброў, як і Біл у Беларусі. І не толькі засвойвае асяроддзе гэтай краіны, але і эксперыментуе з ім.

Пытанне ролі сучаснай дакументальнай фатаграфіі для незалежнага назірання і захавання момантаў жыцця, яе выкарыстання ў кнігавыданні і прэсе надзвычай важнае зараз для беларускіх фатографаў. Будучае беларускім фотамастакам бачыцца вельмі неакрэсленым. Сыгралі тут ролю і адсутнасць спецыялізаванага друкаванага выдання, музея фатаграфіі, ці хаця б сур'ёзнай калекцыі ў адным з рэспубліканскіх музеяў. Фотапраектамі стала займацца толькі сама галерэя "Nova", а адкрыццё аддзялення па падрыхтоўцы прафесійных фотамастакоў у Беларускай акадэміі мастацтваў з'яўляецца справаю будучага. Пра фінансавую падтрымку беларускія фотамастакі сёння нават і не згадваюць. Праўда, тая ж Чэхія фотамайстрам не прапаноўвае дзяржаўнай падтрымкі, кожная выстава ці альбом ствараюцца на спонсарскія грошы, знайсці якія таксама складана...

Але, думаецца, праблема тут больш глыбокая, чым матэрыяльная галеча. Адносіны да дакументальнай фатаграфіі фарміруюцца перыядычнай прэсай як да каментатара тэксту, звычайнага фіксатара падзеяй.

Быць фотамастаком стала на Беларусі нятанна і непапулярна. Тым больш гэта патрабуе вялікіх духоўных высілкаў, каб знайсці сутнасць моманту, яго вольнае разуменне, прапусціўшы жыццё праз сябе, асабліва калі гаворка ідзе пра сённяшнюю Беларусь...

Н.ШАРАНГОВІЧ

ПАМЯЦЬ

"Яшчэ сустрэнемся..."

Радзеюць шэрагі тых, хто ведаў пісьменніка Аляксея Карпюка падчас Вялікай Айчыннай вайны, ці навучання ў Гродзенскім педагагічным інстытуце. На шчасце, засталіся пісьмы. Аляксею Нічыпаравічу пісалі шмат. Шмат лістоў дасылаў і ён. Частку з ліставання прапаную ўвазе чытачоў "ЛіМа".

А. Карпюк — бацькам. 13.2.1945

"Зараз я знаходжуся ў Дзеючай Арміі ў Германіі... Наконт Валодзі (брат А. Карпюка. — **А. Л.**) Вы пакуль што не вельмі ўбівайцеся. Няма чаго без часу яго хаваць. Я ўпэўнены, што ён прыйдзе. Прашу перадаць маім былым партызанам мой адрас".

Бацькам. 19.2.1945

"Гонім немцаў. Разлічваемся за ўсё. Літасці да іх ніякай няма. Паўсюдна трупы, трупы. Па дарогах, палях многа нямецкай тэхнікі, разбітай нашымі войскамі. Гэтае пабоішча цяжка выкласці на паперы. Аднойчы быў у Варшаве пры вызваленні, дык там не бачыў аніводнага цэлага дома... Дашлі, бацька, мне фота, дзе ты з мамай..."

Бацькам. 19.3.1945

"15 лютага ў 13.00 быў паранены на шашы сярод лесу. Акружылі групу немцаў, якія хацелі вырвацца. Мы дапамагалі адбіваць атакі. Мяне параніла асколкам снарада ці ручной гранаты, кінутай з блізкай адлегласці. Закранула толькі мяккую тканку пляча. Быў у медсанбаце... Мясцовасць, дзе застаўся Валодзя, яшчэ не занята нашымі. На днях гэта будзе зроблена. Тады і дачакаемся ад яго вестак.

Шкада, што Вы не можаце бачыць, як немкі і старыя немцы, і тыя, хто здзекаваўся над нашымі палоннымі рабочымі, называў іх "швайн", зараз самі апынуліся ў такім жа становішчы. Усміхаюцца, працуюць на нас. Кажуць, што ва ўсім вінаваты Гітлер. Але ўсё ж такі нам ніхто не верыць".

А. Карпюк — з вайсковага дзённіка. 15.4.1945

"Мы на Одэры. Вучымся фарсіраваць раку. Я ў абозе. Як так? Прашуся на перадавую. Камбат дазваляе. Прызначылі наводчыкам да Разбокава. Першы эшалон. Немцы пастрэльваюць. Вечарам асколкі ўдарылі ў сценку над галавой..."

Бацькам. 25.4.1945

"Знаходжуся на вуліцах сталіцы Германіі — Берліне. Не ў якасці пленнага раба, а як дыктатар. Нас чакаюць апошнія бai".

Бацькам. 30.4.1945

"26 красавіка ў Берліне каля гадзіны дня паранены ў другі раз. Рана сур'ёзная. Асколак паміж 9 і 10 рэбрамі прабіў ніжную частку лёгкага і застраў. Прытомнасці я не губляў. Сам прыйшоў у санчастку. 27 зрабілі аперацыю, падшылі лёгкае, стала зручней дыхаць. Тэмпература была 38-38,1. Крыўдна, што паранілі ў апошнія дні вайны. Я ваяваў не для геройства, не для ўзнагарод, а проста гэта ў мяне ў натуры ляжыць, каб не хавацца ў кутках ці за чужой спіной. За прарыў абароны праціўніка на Одэры я ў ліку шасці чалавек з палка быў прадстаўлены да звання Героя Савецкага Саюза. Указ аб першых узнагароджаных прыходзіць, мяне чамусьці няма. Хаця, чаму здзіўляцца, я ж "заходнік". Людзям зверху падаюся нейкім контррэвалюцыянерам... Галоўнае, людзі, з якімі бліжэй жывеш, разумеюць цябе...

Мяне зноў эвакуіруюць. Я прайшоў з баямі з плацдарма на поўдзень ад Варшавы праз Паўночную Памеранію да Берліна".

Бацькам 24.5.1945

"Знаходжуся недалёка ад Берліна. Была тэмпература не ніжэй за 39 градусаў. Прайшоў рэнтген. 10 асколкаў у грудной клетцы засталося. Доктар сказаў, што так і застануцца,

Скарбы чырвонай брамы

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 5)

Я ведаў, што яна пралегла ад чырвонай брамы, што тую чырвань запаліў не толькі заход сонца, яшчэ за брамаю аж тры родныя хаты гарэла ў полымі злачынстваў, ляжалі ў зямлі вугаллем-прысакам войнаў і рэвалюцый, што далей ад брамы дарога ляжала праз Камарын, Дняпром — у Кіеў, з Кіева — у Львоў, з адной вучэльні на мастака ў другую, ад меншай у большую.

— За чырвоную браму я выйшаў у сорак пятым. Год быў цяжкі. Вучылі мяне ўсёй раднёй. Брат Мікалай працаваў аграномам і палову заробку пакідаў сабе, а палову аддаваў мне. Пасаблялі, як маглі, і мама, і дзед Міхась, і баба Сынклета.

Баба Сынклета сядзела на парозе вясковай хаты і на прыполе ў місе трымала яйкі. Нібыта несла з-пад курэй і прысела перадыхнуць, на яйкі падзівіцца: чысцюткія, бялюткія, буйныя.

— Яйка было ў нас у вёсцы сімвалам жыцця. — Во як! — а філасофія Сынклеты ў чатырох словах: Бог даў — Бог узяў. Тут — і жыццё чалавека, і ўвесь свет. Бог даў жыццё — жыві, пра смерць не думай, пра яе Бог падумае, жыві так, каб Бог ад цябе не адвярнуўся. Гэтак жыла Сынклета. Верыла ў Бога і сваю веру сеяла ў душах. А я, бывала, як да яе зайду, абавязкова перахрышчуся. Нідзе больш, а ў яе заўсёды.

Баба Сынклета, як я заўважыў, гонар мастака, як і Пампей, у святым німбе. А бацька, маці?

— Ад мамы я навучыўся працаваць. Кладзешся спаць, а яна яшчэ працуе, прачнешся — ужо яна працуе. Калі спала, мы, дзеці, не бачылі. І чым далей жыву, тым больш пераконваюся, што навука працаваць для мастака самая патрэбная. Які б талент ні быў, а без вялікай працы мастак не атрымаецца.

Партрэт маці — у цэнтры на сцяне. Вакол яе — сыны, вясковыя кабеты, хаты, крыжы, дарогі, ручнікі, партрэты жонкі мастака Мацільды Адамаўны. І нават — Жыцень?..

— Ад мамы, ад дзеда Міхася, ад Сынклеты мы з братам ведалі шмат народных песень, паданняў... І пра Жыценя мама казала. Дзядок невялікі, валасы тырчаць ва ўсе бакі, віхрасты, прыгнуты, ідзе нячутна, добры, але як раззлуецца, то бяды наробіць. Увосень ходзіць па палях ды выглядае, хто як працаваў. Знойдзе бароды непрыбранага калосся — завяжа ў сноп і сноп паставіць на чыста прыбраным полі. У наступным годзе там, дзе знайшоў бароды, будзе неўраджай, а дзе паставіў сноп — зародзіць жыта. Яшчэ дзед Міхась казаў, што злаваць Жыценя не трэба, а то завяжа жыта ў вузел — бяды не мінеш. І птушак любіць, дагледае, аберагае.

Як жа было не натхніцца пачутым ад дзеда і маці, якія гэтак паэтычна казалі пра Жыценя, быццам мелі шчасце трымаць яго калі не за бараду, дык за руку, і самі бачылі, як той завязвае бароды ды чубы. Натхненне мастака аказалася на ўзроўні народнага, і пад пэндзлем атрымаўся дзядок у жыце: вусы ды бровы — спелае калоссе, падрэзаная барада — колкія голкі ржышча, вочы з-пад каласоў ды з каласоў высвечваюць сінюткія, як васількі па жытніх межах, кожнага свідруюць дапытлівасцю, а ў жмені пук жыта, каб вузел завязаць — каму на пакаранне ці навуку?, — але і птушкі тут, у жыце, сядзяць спакойна пад дзедавай аховай, перапёлачкі, нібыта супакойваюць запалоханых, што дзед не злосны, справядлівы, і яго кара — ад дабрыні, любові да ахайнасці, ад рупнасці. Тут навука сэрцу добраму і сэрцу абыякаваму, тут таямніцы не пустыя асенняй ночы, ад якой можна чакаць бяду і радасць, трывогі і спакой, тут дыхаюць зямля і неба, зямля — зямным, спелай збажынаю, неба — высокім, дзе жывуць багі, нават такія, што на зямлю сыходзяць да людзей, як Жыцень, усё пра нас ведаюць. Тут бачыш ды чуеш паляшуцкае паданне ў рэі збіральніка тутэйшага фальклору Сержпутоўскага і разам з тым украіншчына, якая не проста па суседстве за Прыпяццю, геаграфічна блізкая, але духоўна свая з маленства для мастака, які ў прасторы ад Прыпяці да Кіева і ад Кіева да Львова меў ахвоту і час надыхацца высокае паэзіяй яшчэ і ад Гогаля, ад бачанняў бурсацкага філосафа Хамы.

Тут, можа, сама школа жывапісу? Народнага і свайго, далёкага ды блізкага ў часе, паэтычна-ўзнёслага ды будзённага. Найжывапіснейшых узаемных пранікненняў, уплываў душ родпасных.

— Калі я выйшаў за браму, ішоў у далёкі свет, на Беларусі не было сваёй мастацкай школы.

— А Віцебск?

— Там былі таленавітыя настаўнікі і геніяльныя вучні, але не было нацыянальнай школы. Перад беларускім хлопцам у жывапісе ляжалі рэальна дзве дарогі: адна — саматужная, другая — праз школы суседніх народаў і мастацтваў, на поўначы — Расіі, перадзвіжнікаў, на поўдні — Кіева і Львова. Мяне, палешука, завабіла суседка Украіна. Адно ў нас Палессе, адна Прыпяць, адны гістарычныя карані, блізкія мовы, песні, але там больш нацыянальнай волі, як у нас, а воля — глеба, на якой вырастае і каласуе народ. Я туды ішоў па навуку жывапісу, а вярнуўся пераканаым нацыянальным мастаком. Пасля Львова, мастацкага інстытута, працаваў у Малдавіі. Прайшоў і там навуку. На поўдні глыбей пераконваешся, што мастацтва караніцца ў нацыянальнай глебе. Там я адчуў, што ні ўкраінскім, ні малдаўскім, ні рускім мастаком я не буду, што я беларус, мастак беларускі. І я вярнуўся да сваёй чырвонай брамы.

На сцяне вісела карціна, якая мне падалася, як цяпер кажуць, знакавай. Матыў звычайны для Палесся: буслінае гняздо, у ім бусляняты, дзюбы ў якіх яшчэ не выспелілі, чорныя, а над імі — матка бусліная шырока распрасцёрла крылы. У звычайных для Палесся сюжэце і вобразе прачытвалася незвычайнае для мастака, які без бацькі рос пад матчынымі крыламі. А потым убачыў фотаздымак: маці, Надзея Міхайлаўна, трымае на каленях, абхапіўшы рукамі, нібыта крыламі, абодвух хлопчыкаў — такі паўтор, як у гняздзе, матыву мацярынства. Але, калі размова зайшла пра нацыянальную ідэю, адчуў, што і гэтакае бачанне карціны няпоўнае: у гняздзе буслінім, у крылах мацярынства, у выяве бусліхі-маці, як у чалавечай маці, жыла Айчына — не толькі матыў ды вобраз, а наш нацыянальны шлях — тэма не аднаго матыву і не адной карціны, а на ўсё жыццё. Пачатак тэмы, магчыма, быў тут — у матыве буслінага гнязда? І не мае значэння, калі матыў напісаны, раней, як тэму рушыла паводка птушыных крылаў, альбо пазней, у рэчышчы паводкі, — прываблівае пачуццё, укладзенае ў вобраз, дастатковае, каб кожны раз, працуючы над тэмай, знаходзіць усё новыя ды новыя арыгінальныя выявы, даваць ім нечаканыя і смелыя мастацкія рашэнні. У кожнай рабоце, у кожным вобразе і птушкі, і крыла жывога, апантанага змагаўцы з вышынёю, нават неверагоднаю, касмічнаю, ёсць адчуванне ўзнёслай рамантычнай мары і маладой крыві. Калі не кожнаму па сілах тэма трымае мастака ўсё жыццё, то ці не азначае гэта, што мастака не пакідае маладосць?

Ён успамінае:

— Палессе ў вачах з маленства: і край, і рай птушыны. Вясна, бывала, пачнецца — аблогі стогнуць ад шолаху і свісту пёраў. Тут птушыны міжкантынентальны порт. Усе птушкі, што праз Палессе лятуць з поўдня на поўнач і з поўначы на поўдзень, садзяцца тут, кормяцца, гняздуюць, ладзяць вяселлі, кірмашы, а мы, дзеці, гадаваліся на іх падобныя. Не хадзілі — лёталі. Рукі і ногі выраслі доўгія, нібы ў птушак крылы, ногі. Раскінеш рукі і ляціш з гары на рэчку, а там — вада, зямля і неба птушкамі затканыя. Такое дзіва!..

Зусім не дзіва, што ўзгадаваны ў царстве птушак, мастак злавіў аднойчы на пэндзаль адну з іх, а за ёю ўзняў у неба цэлы вырай. Сам не чакаў? Магчыма. Але свой вырай закружыў на доўгія гады.

"Крылы I".

"Крылы II".

"Крылы III".

"Крылы IV".

"Крылы V".

Чым паяднаў іх мастак? Малюнкам, колерам, імклівасцю палёту? Дзе перавясла, што звязвае, яднае крылы ў вырai? Была задума памірыць зямлю і неба?

— Пісаў я радасцю...

А радасць — не перавясла? Гармонія крыла і крылаў — хіба не вечная крыніца прыгажосці ды радасці? Трэба яшчэ паяднаць радасць і прыгажосць з сэнсам, з мэтай? Вядома. Асабліва для нашага мастака, які і прыгажосць, і радасць на поўную волю не адпусціць. Ён іх не зняволіць, ні ў якім разе, але з разумным сэнсам павянчае, выштукуе вянец — шлюб вечны.

— Я крылы першыя задумаў белымі...

Вось яно: пісаў дзяцінай, лічы — стыхійнай, радасцю, і ў той жа час задумаў крылы белымі: светлымі, чыстымі, як святасць. Нагледзеўшыся ў птушыным царстве на чаек, буслоў, гусей? Не толькі. Усё белае з маленства — свята: печ беленая да Вялікадня, пагафтаваныя фіраначкі на вокнах, бабулінымі ці мамінымі рукамі вытканыя ручнікі, крылы дзедавага ветрака. Белы зямны колер — шлях беларуса, як млечны ў небе — шлях Бога. А крылы — ручнікі ў небе. Усё, што ёсць рэч, мае свой цень, нават крупінка рэчы. І белае крыло — таксама? Ну, вядома, але цень — не цемень. Хай хоць крыжуе белае крыло — яно яшчэ чысцейшым выглядае ў высокім небе.

— Крылы імкнуцца ў неба, а там — блакіт...

Блакітных пара крылаў — сталасць белай мары, прарыў рамантыка ў найвышэйшую рэальнасць. А далей — што за блакітам? Зноў рай ці пекла? Агняны кратэр, вогнішча, жароўня? Там плата за палёт у блакіце як радасці, раскошы? Дык што рабіць? Ляцець у вогнішча ці павярнуць назад? Што мае большы сэнс — рызыка ці асцярога?

— Для светлай мары няма пытання. Праз полымя ляжыць шлях вартага і годнага жыцця...

Крылы ў агні смыляць, але ляцяць далей і вышэй. Што там, далей? Бой? Яны гатовыя на бой хоць з д'яблам: меч бліснуў пад крылом. О, там мужны рыцар? Але ён не анёл з нябесных войскаў Бога — дзіця зямное, завабленае небам, узнятае на крылах белай мары. Пральецца кроў? На белае крыло чырвоны пасак ляжа? Гэта — наш сцяг, наш лёс. Ён — Богам блаславёны. Мы — з Богам!

— Залоціць крылы сонца...

За мужнасць і адданасць небу ёсць узнагарода — сонца. Яно прывеціла крылатага Ікара, сагрэла крылы і чало, у кожнае пёрца ўпляло сваё ласкавае прамянне. Ікар, нібы святы, паруе вольна, узняўшы годна крылы і склаўшы рукі на грудзях. Бог даў яму німб святасці, а ён ляціць па небе і тужыць па зямлі, глядзіць

на здароўе не паўплываюць. 12 мая вызвалены канцлагер Штутгаф, дзе быў Валодзя".

Бацькам. 15.6.1945

"Вылечваюся. Хаджу на перавязкі. Не хапае паветра пры доўгай хадзьбе, калі падымаюся на чацвёрты паверх. Раней не мог 3-4 мінуты ўголас чытаць, задыхаўся. Цяпер лепш. Доктар дае тэрмін для выздараўлення месяцаў 6-8. Паслаў пісьмы многім знаёмым у Страшава. Але ці ёсць хто там?

Калі я быў у канцлагеры Штутгаф, там было многа палякаў з Пазнані. Я паслаў пісьмы у пазнаньскую газету з пытаннем пра далейшы лёс лагера, зняволеных і папрасіў адрасы былых арыштантаў. Гэта мне паведамілі ў Саюзе былых польскіх палітычных зняволеных, куды мяне накіравалі з рэдакцыі газеты. Пра Валодзю паведамяць, калі нехта ведае пра яго. Добра было б самому пахадзіць па адрасах. Доктар мяне злавіў, калі я хадзіў па бальніцы, і пагнаў у ложак, забараніў хадзіць".

С. Налівайка — А. Карпюку. 20.6.1946

"Вы з Валодзей — сумленныя, сціплыя, адкрытыя і адданыя Савецкай Радзіме хлопцы. Аляксей, ты паступіў высакародна, пакінуў работу і пайшоў на фронт. Мы вельмі рады, што табе ўдалося ўцячы з палону, стварыць партызанскі атрад, стаць камандзірам...".

Я. Паес — А. Карпюку. 18.7.1945

"Ты, Аляксей, сапраўдны герой. Намеснік па палітчастцы цябе ўспамінаў перад палком. Палку далі Чырвоны Сцяг. Цябе ўзнагародзілі ордэнам Айчыннай вайны. Так шкада, што цябе не было пры штурме рэйхстага. Гэта была страшная, але вялікая карціна.

Твае фотаздымкі прапалі разам з фотаапаратам — разбіла асколкам. Толькі адна ёсць: тая, якую зрабілі раніцай таго дня, калі цябе параніла..."

А. Карпюк — з вайсковага дзённіка. 21.7.1945

"Даўно не пісаў. Сёння зноў узяўся. Валодзя знайшоўся. Камбат паведаміў маім бацькам аб прадстаўленні мяне да звання Героя Савецкага Саюза. Акадэмія замежных моваў у Маскве, пра якую пішуць дзяўчаты, вельмі мяне зацікавіла. Дбайна вучу англійскую мову. Вучыцца там — гэта тое, што мне трэба. Вырашыў напісаць у "Красную звезду". Думаю далей пісаць маленькія апавяданні з партызанскага жыцця-быцця... Які ён зараз, Валодзя Калеснік? Чатыры гады назад быў выдатны хлопец. Яму цяпер толькі 19. Шкада, што не магу наладзіць з ім перапіску. Яшчэ сустрэнемся..."

Гэтыя пісьмы ахопліваюць перыяд з лютага па ліпень 1945 года. Час трагічны для Аляксея Карпюка. Ён двойчы быў паранены. Яго брат Уладзімір знаходзіўся ў фашысцкім канцлагеры Штутгаф. Новае для чытача тое, што будучы пісьменнік узгадвае пра сваё жаданне пісаць "маленькія апавяданні". У красавіку 1945 года ён пачынае весці франтавы дзённік. Да з'яўлення першай уласнай аповесці было яшчэ доўгіх восем гадоў...

Антон ЛАБОВІЧ

адтуль уніз ды моліцца хацінам. Ён, дзіця зямлі, працяў сваім палётам неба, зрабіў усё, што мог, і прагнуў, скарыў магутным крыллем усе вышыні, злучыў зямлю і неба, даў небу веру ў сілы і чысціню зямлі, вярнуў зямлі надзею ўратавацца высокім небам. Далей куды ляцець?

— Апошнія крылы чорныя. Гэта — канец... Смерць?

Навошта?

Хіба святлом нельга закончыць падарожжа крылаў у глыбінях неба, як яшчэ зусім нядаўна зрабіў бы напэўна кожны мастак сацрэалізму?

— Я рэаліст...

Ён і філасоф. З тых, хто свае крылы, як рэалісты, складалі на Салаўках, на Вішары, на Магадане. Іх тая доля ў мінулым? Хай дасць нам гэта Бог — жыццё без Салаўкоў, без Вішары, без Магадана. Ён рэаліст — успомнім — ад Сынклеты: Бог даў — Бог узяў. А гэта значыць, што смерць крылаў — не канец свету. Крыло, якое дастала сонца, дастала вечнасць. Смерць Ікара дае зерне жыцця ў крыллі новым, маладым, якое таксама паляціць да сонца і па сонца. Няма жыццядайнага зярняці ў хлусні светлага канца. Але чаму паміж абвугленага крылля ў прасторы ночы гарыць, як святлафор, чырвонае вока? Кропля чырвані свідруе ўсіх насельнікаў зямлі — распальвае ў сэрцах прагу вышыні і сонца?..

Здзекуецца з хіжых?..

— Вы бачылі Гаспадара Палесся?

Мастак гэтак спытаў, што я адчуў у слове — Гаспадара!

— Вашу карціну? — перапытаў я. — Прызнаюся, не бачыў.

— Як-небудзь паглядзіце.

— Там бусел, ведаю.

— Вялізны, белы.

Ажно ніякавата адчуў сябе перад яго светлымі, з блакітам неба, дзе пралятаў Ікар, вачыма: мастак ім, Гаспадаром Палесся, ганарыўся, а я не бачыў—ай-яй! Затое адчуў, здаецца, большае, як само пытанне: ці не Гаспадар у высокі космас блаславіў самога мастака і ўсю яго сімфонію бялюткіх крылаў? Ды й не адных птушыных. Туды, у неба, імкнуліся ляцець мужчыны і жанчыны, прырослыя як быццам да зямлі, коні, дрэвы, кветкі, камяні, крыжы, нават квадрат Малевіча адтуль вярнуўся на зямлю і, нібы з люка карабля, выкідваў сейбіта і Еву, спакушальніцу з чырвоным яблычкам у руцэ, самога мастака з палітрай. Хто ім усім даў крылы? Сталі тры кабеты, у кожнай у думках і ў сэрцы жыла надзея, кожная сваю надзею мкнула ў неба: адна — да Бога, другая — да каханка, трэцяя — да дзетак. Там усе тры бачылі надзею, хоць глядзелі на зямлю, дзе быў Гаспадар. Па небе над вёскаю ляцела на ружовых крылах ранняе вясны Лада, багіня і дзяўчына, ляцела з кветкамі, якія ўніз працягвала жанчыне, што выганяла з хлева карову на маладую пашу, і маладым, якія яшчэ напэўна спалі за прыцемненым дрэвамі акном. І мудрай радасцю ззяла дзяўчынка, адчуўшы, што яе ручкі — крылы: цягнулася імі да сонейка.

Туды, дзе неба, у тую чысціню, усе імкнуліся. Адны туды ляцелі на белых крылах, а другія караскаліся па чорных лесвіцах, зрываліся з іх, бразгаліся вобзем, ачуньвалі, зноў паўзлі да сваіх лесвіц, зноў дзерліся па іх на неба. Нехта з бяскрылых ляцеў на парасоне — таксама хацеў да сонца? З камення будавалі ў неба гмахі ўсё вышэй, вышэй, а пад імі, гмахамі, ляжалі руіны раней пабудаваных гмахаў, і нават стаяла вежа Вавілонская, дакладней — ад вежы камель, як помнік дурням. Нават самыя ўбогія той вышыні шукалі — гарбамі беспрасветных халуёў шлях клалі да ката, хлуса ў белай сарочцы, пад гальштукам прыстойнасці, кесара саманазванага, які свой партрэт узяў у раму святасці і даў народу: маліся, чэлядзь, бацьку — трапіш у рай. І халуі маліліся не Богу — дурню.

Тэатр абсурду абліваўся потам — ад веку ў век.

Мастак усё і ўсіх бачыў. Адным захапляўся, з другіх смяяўся, усім хацеў пасобіць, нават халуям і кесару, даючы адным — крылы, другім — розум. А сам працаваў дзень пры дні. Былі і ночы — адпачынак. Спаў, як Харытон, бацька, да раскулачвання, кулак падклаўшы пад галаву, напрацаваўшыся і сіл не маючы дайсці да ложка. Анёлы над ім не спалі, сон мастака ахоўвалі ад злыдняў, а ён у сне бачыў працягі свайго жыцця — сюжэты, вобразы, колеры. Чуў пошум крылаў. Лёталі анёлы ці птушкі? Ці сам ляцеў далёка і высока? І сам, вядома. Бо ведаў, што мастак без крылаў — Сізіф, які ніколі не ўскоціць на гару свой аграмадны камень...

То ляцеў, то плыў...

Куды ж ён плыў?..

Шлях па Дняпры ў Кіеў

Параход быў — ну проста дзіва: сам бялюткі, труба над ім чорная, яе працяг у небе — чорны дым, па борце справа — вялізнае кола, як у Пампеевым млыне на Брагінцы, з лапамі-клацамі грэбсці ваду — па рацэ: пялёх, пялёх, пялёх. Ад Камарына па Дняпры ў Кіеў ён, небарака, пялёхкаў ноч і дзень — цэлыя суткі. Вёз у старажытную сталіцу палешукоў з мяхамі, хатулямі, скрынямі.

Была ноч першага лета той жудаснай вайны, быў толькі трэці ад вайны ціхуткі месяц — жнівень. Людзей на параходзе — біткам. Гаўрыла знёс свой драўляны чамадан па вузкай лесвіцы ў трум, пралез паміж людзей да трубы, што гнала дым у неба. Труба была цёплая. Пад ёю паставіў чамадан, сеў на яго, спіною прыхінуўся да трубы і заснуў.

Сніў тое, што было надоечы, нібы хто ў галаве пракручваў кінаплёнку. Як выйшаў з маці за парог, як развітаўся, як пайшоў, азірнуўся, здзівіўся, якая чырвоная брама, нібы ў полымі стаяла, пайшоў хутчэй, каб не гадаць, ісці альбо вярнуцца, спужаўшыся той чырвані. Тым часам сутонела, і ён спяшаўся, каб не спазніцца на параход. У цемені, як падыходзіў да Камарына, з дарогі збіўся, шукаючы кароткую, блукаў, пераскокваў праз нейкую рачулку і пакаўзнуўся, у касцюме з чамаданам шаснуў у ваду па пояс. Бяда і радасць. Бяда, што выкупаўся ў вопратцы, а радасць — чамадан ўратаваў, паспеўшы выкінуць на бераг, не замачыў у ім сухары, якія мама сушыла, збіраючы ў дарогу сыну. Мокры прыбег у Камарын на прыстань, а парахода няма — цяпер ужо ён пазніўся.

Сон і не сон — усё як было.

Прачнуўся ад рогату людскога. Ускапіўся: хлопец з дзяўчынаю над ім стаялі, рагаталі. Чым ён быў смешны? А тым, што пара ад яго ўгару валіла, як дым з трубы.

Да раніцы ў цяпле абсох. З трума на палубу падняўся — сонца стаяла ў небе над Дняпром і чайкі над вадою кружылі, ныралі, лавілі рыбу, узляталі, зноў сыпаліся на ваду. Піск, енк.

На палубе дзень прастаяў, любуючыся вялікае ракою.

У град Кіеў, славянскую сталіцу, параход прыплыў таксама ноччу. Але гэта была не тая ноч. Агнямі залатымі былі ўсыпаныя абодва берагі і неба, і ўсе агні, што па берагах ды ў небе, адбіваліся ў рацэ. Усё наваколле здавалася адным неверагодным пажарам — палалі вада, зямля і неба.

Над параходам, паміж ім і небам, насустрач плылі адзін за адным масты — даўжэзныя, ад берага да берага, залочаныя ручнікі.

Яны віталі параход?

Было ўсё новае, чужое і фантастычнае, як казка, свята,

А за кармою парахода, над ім і побач з ім ляцелі, нібыта варта, чайкі — як тыя самыя, што з Камарына праводзілі, усю дарогу вялі, нібыта лоцманы, каўчэг палешукоў.

Крычалі — раніцы і сонцу радаваліся.

І супакойвалі. Як сапраўды свае — крылатыя палешукі.

Іван СІНЯЎСКІ

15 верасня на 83-м годзе жыцця памёр вядомы беларускі пісьменнік, ветэран Вялікай Айчыннай вайны Іван Сіняўскі.

Нарадзіўся Іван Іванавіч Сіняўскі 22 чэрвеня 1919 года ў вёсцы Жажэлка Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і. Скончыў літаратурны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага ў 1941 годзе. У гады Вялікай Айчыннай вайны быў сувязным Смалявіцкага падпольнага райкома партыі, партызанам атрада імя В. Чкалава ў брыгадзе "Смерць фашызму". Пасля вызвалення Беларусі некаторы час працаваў інспектарам Смалявіцкага райана, а затым быў прызваны ў Савецкую Армію. Удзельнічаў у вызваленні Варшавы, у баях за Берлін. З 1946 года — настаўнічаў, працаваў дырэктарам Жажэлкаўскай сямігодкі, выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры. Жыў у Жодзіне.

Першыя вершы Іван Сіняўскі надрукаваў у раённай газеце "Шлях калектывізацыі" яшчэ калі вучыўся ў школе. Шмат твораў прысвяціў дзецям. Менавіта для юнага чытача напісаў і выдаў зборнікі апавяданняў "У навальніцу", "Новая школа", "Піянерскі гальштук", "Дабрадзейка", "Ой, рэчанька, рэчанька", "Марка", аповесць "На правым флангу" і іншыя. Вядомыя яго кнігі прозы "Вернасць", "А вяселля не было", раман "Дарога на Замлынне" і іншыя, напісаныя ў 1960—1980 гадах і ў апошні час.

Іван Сіняўскі быў чалавекам сціплым, добрым, спагадлівым і прынцыповым у сваіх учынках і паводзінах, рупным працаўніком. Ён здзейсніў самы галоўны жыццёвы подзвіг — са зброяй у руках абараніў Радзіму ў грозны ваенны час, старанна вучыў і выхоўваў моладзь.

Пісьменнік быў узнагароджаны ордэнамі і медалямі, карыстаўся вялікай павагай сярод людзей, у пісьменніцкай арганізацыі.

Светлы вобраз пісьменніка і грамадзяніна Івана Сіняўскага назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах.

Саюз беларускіх пісьменнікаў

Свой след

Нядоўгім быў жыццёвы шлях Пятра Дудо. Нарадзіўся 4 верасня 1911 года ў вёсцы Забалацце цяперашняга Лепельскага раёна. З 1935-га служыў у Чырвонай Арміі. У 1940 годзе скончыў Камуністычны інстытут журналістыкі ў Мінску. Працаваў намеснікам галоўнага рэдактара газеты "Вольная праца", што выходзіла ў Беластоку. У гады Вялікай Айчыннай вайны быў палітработнікам, супрацоўнікам армейскага друку, а затым карэспандэнтам газеты Беларускай ваеннай акругі "Во славу Родины". Памёр 23 лютага 1958 года. Ды і напісаць паспеў не шмат. З нарысамі і апавяданнямі пачаў выступаць у перыядычным друку з 1934 года. Аўтар аповесці "Першы салдат", сатырычнай камедыі "Чортаў тузін". На жаль, творы П. Дудо не перавыдаваліся.

"Беларуская думка", № 8

Апавяданне І. Шамякіна "Трагедыя партызана" і вершы В. Грышкаўца складаюць раздзел "Літаратура і жыццё". У раздзеле "Асоба" прадстаўлены нарыс А.Марціновіча "Важна рэй вадзіў Буйніцкі", у якім расказваецца пра І. Буйніцкага, з дня нараджэння якога споўнілася 140 гадоў. "Як Беларусь Сен-Сімона нарадзіла" — слова А. Вішнеўскага пра нашага выдатнага земляка Сцяпана Міхаіла Аскерку, ураджэнца Навагрудчыны, аўтара працы "Неабавязковы план дзеля найхутчэйшага асваення пусткавых земляў у Брандэнбургскай марцы", які з'яўляўся саветнікам юстыцыі Фрыдрыха II. С. Князеў выступае з артыкулам "Нацыянальная бяспека: надзеі і рэальнасць". У. Вялічка і В. Шырко запрашаюць наведацца на Ашмяншчыну ("Край старажытны, непаўторны...") А адкрываецца нумар матэрыяламі "круглага стала", праведзенага Г. Булыкай ("Ці такія мы багатыя, каб будаваць таннае жыллё?").

"Жыццё — не знікне..."

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 13)

— Але ў вас ёсць яшчэ адзін сын... Раскажыце крыху пра сваю сям'ю.

— Другога сына завуць Сяргей. Ён у мяне ад другой жонкі — Ларысы. Маці Лявона — вядомая руская паэтэса Святлана Яўсеева, жыве ў Мінску. Сыны мае — аднагодкі, паміж імі ўсяго два тыдні розніцы (Лявон старэйшы). Цікава, што ўсе мы — вераснёўскія: Ларыса, я, Лявон і Сяргей (дзень нараджэння Артура Вітальевіча 23 верасня. — **В. П.**). З дзяцінства Лявон кожнае лета ездзіў з намі ў Крым, і яго з Сяргеем лічылі блізнятамі. Помню, аднойчы мы былі ў Алушце, загаралі на пляжы, а побач апынулася ўкраінская сям'я, і яны ўсе размаўлялі па-ўкраінску. Тады мы сказалі сабе: "А што мы, горшыя? І мы будзем па-свойму!". І з гэтага моманту размаўляем па-беларуску...

— Якой вы ўяўляеце будучыню?

— Будучыня — рэч непрадказальная. Але што б ні было — ёсць я, мая жонка, Сяргей, Лявон, яго сям'я... Ёсць мая ўнучка, мая радзіма — Беларусь... І таму жыццё — не знікне!

Я трымаю ў руках кнігу Артура Вольскага "След завірухі". Гэтулькі тут болю, бачных у радках слёз паэта... Ён адчувае, як "слабее зрок. Цішэюць рухі..."; чуе, як плача, мяльчэючы, Прыпяць, як стогнуць ад чарнобыльскага гора пакінутыя вёскі і сёлы; ведае цану Вялікай Перамогі і ўпэўнены, што "волі не бывае ўволю". Ён надзелены адданасцю сваёй зямлі, надзеяй на Любоў і ўпэўнены, што лепшае з зямных прадвызначэнняў — ісці "пад Хрыстовым Сцягам". А адно з яго лірычных адкрыццяў я проста не магу не працытаваць:

Перад Богам стаўшы на калені,
тлум зямны адкінуўшы спярша,
я шукаю словы для малення —
словы, што выспельвае душа.
Адчуваю сам сябе аблудным
грэшнікам, што топіцца ў дрыгве.
Але вось — павольна, як падспудна,
золак запаліўся і плыве
ў вочы мне...
Падманны ды спакусны
свет зямны хаваецца ў імжы.
І паціху прамаўляюць вусны
словы, недаступныя ілжы.
І мяне выводзяць без прынукі
з цемрадзі, з духоўнае слаты
ў ласцы Боскай знойдзеныя гукі,
што паклаў на сэрца Дух Святы.

Валянціна ПАЛІКАНІНА

Саюз беларускіх пісьменнікаў выказвае спачуванне пісьменніцы Ірыне ЖАРНАСЕК у сувязі са смерцю сястры.